# ЗАСЛУЖАНЫ АМАТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НАРОДНЫ АНСАМБЛЬ ТАНЦА "ЛЯВОНІХА"

## Цэнтра культуры "Віцебск"

Ансамбль танца "Лявоніха" быў створаны ў 1954 годзе на базе Віцебскага гарадскога дома культуры. З цягам часу ў 1971 годзе яму было прысвоена найменне "народны", а ў красавіку 2007 года – ганаровае званне "заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

На нітку доўгага і плённага жыцця калектыву нанізаны, як жамчужыны, вынікі напружанай працы таленавітых кіраўнікоў і ўдзельнікаў ансамбля. Усе яны захоўваюць любоў да танца і перадаюць яе маладому пакаленню танцораў.

Творчая дзейнасць калектыву непарыўна звязана з творчай біяграфіяй заслужанага работніка культуры БССР Леаніда Сцяпанавіча Барадулькі, які на працягу 36 год з'яўлялся кіраўніком калектыву. Адданасць народнаму мастацтву Леанід Сцяпанавіч пранёс праз усё жыццё. Тры пакаленні яго сям'і звязалі сваё жыццё з ансамблем. Пастаўленыя ім танцы і сёння выконваюцца ўдзельнікамі "Лявоніхі" і працягваюць уражваць гледачоў. Творчыя задумкі Леаніда Сцяпанавіча падхапілі кіраўнікі ансамбля: Вольга Панэ, Дзмітрый Цімошчанка, Міхаіл Ананьеў. Нельга не адзначыць і адміністратара калектыву – Самсонаву Людмілу Яўгенаўну...

Рэпертуар ансамбля шырокі і разнастайны. Гэта каля 50 самастойных харэаграфічных пастановак, вакальных і інструментальных кампазіцый. У канцэртныя праграмы калектыву ўваходзяць гульнявыя, сюжэтныя, тэматычныя, фальклорныя беларускія танцы, а таксама танцы народаў свету. Трэба адзначыць, што менавіта майстэрствам і эмацыянальнасцю ў дэманстрацыі беларускай нацыянальнай культуры, вялікай адданасцю беларускаму фальклору, а значыць і гісторыі народа, ансамбль танца "Лявоніха" заваяваў прызнанне гледачоў.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца "Лявоніха" – пастаянны ўдзельнік гарадскіх, абласных і міжнародных мерапрыемстваў (каля 50 выступленняў у год). Ансамбль прымаў удзел у акцыях і шматлікіх святочных канцэртах, прысвечаных Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дню жанчын, Дню яднаннаня народаў Беларусі і Расіі, Дню Перамогі, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Штогод калектыў – удзельнік Міжнароднага фестывалю "Пурымшпіль" у Віцебску, абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі "Дажынкі", мерапрыемстваў карпаратыўнага фестывалю самадзейных творчых калектываў і выканаўцаў даччыных таварыстваў і арганізацый ААТ "Газпрам" "Факел" і іншых. "Лявоніха" – жаданы госць на юбілейных і прафесійных канцэртах прадпрыемстваў

і ўстаноў горада і вобласці, прысвечаных Дню настаўніка, Дню работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, Дню міліцыі, Дню работнікаў бытавога абслугоўвання і камунальнай гаспадаркі, Дню медыцынскага работніка, Дню энергетыка і іншым. Трэба адзначыць і тое, што ансамбль з'яўляецца пастаянным удзельнікам урачыстай цырымоніі і канцэрта, прысвечаных ушанаванню лаўрэатаў звання "Чалавек года Віцебшчыны", а з 1991 года прымае ўдзел у мерапрыемствах Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску": урачыстых адкрыцці і закрыцці фестывалю, канцэртах Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу "Віцебск" і Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск" і іншых. У 2016 годзе ўпершыню акампаніруючая група Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага ансамбля танца "Лявоніха" прымала ўдзел у II Фэсце вулічнага мастацтва "На сямі вятрах", які праводзіцца ў межах "Славянскага базару ў Віцебску".

"Лявоніха" шмат разоў прадстаўляла нацыянальную культуру Прыдзвіння за мяжой: у Алжыры, Грэцыі, Іспаніі, Італіі, Канадзе, Польшчы, Расіі, Украіне, Францыі. Калектыў з'яўляецца ўдзельнікам з беларускага боку праекта №LLB-1-072 "Даўгаўпілс–Віцебск: культурнае супрацоўніцтва і развіццё" праграмы трансмежнага супрацоўніцтва "Латвія-Літва-Беларусь", якая рэалізуецца ў межах Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства (Даўгаўпілс, Латвія). У межах праекта ладзяцца шматлікія канцэрты, майстар-класы, абмен вопытам. Так, ансамбль "Лявоніха" прымаў удзел у Велікодным канцэрце ў г. Даўгаўпілс (Латвія), майстар-класах (г. Віцебск, г. Даўгаўпілс), святах "Ліго" (г. Даўгаўпілс, Латвія) і "Купалле" (г. Віцебск, Беларусь), Днях Латвіі (г. Віцебск, Беларусь), Днях горада Даўгаўпілса (г. Даўгаўпілс, Латвія). Ансамбль "Лявоніха" выязджаў у г. Даўгаўпілс (Латвія) для ўдзелу ў Міжнародным "карагодзе" танцавальных калектываў "Саданцыс". У межах мерапрыемства кіраўнік і балетмайстар ансамбля далі майстар-класы па беларускіх танцах для астатніх удзельнікаў з Латвіі, Літвы, Расіі, а таксама самі бралі ўдзел у майстар-класах па рускіх і латышскіх танцах. У 2015 годзе ансамбль "Лявоніха" браў удзел у моладзевым фестывалі "Моладзь за Саюзную дзяржаву" ў г. Растоў-на-Доне (Расія). 2016 год быў для калектыву больш насычаным на падзеі: артысты прымалі ўдзел у VII Абласным аглядзе-конкурсе харэаграфічных калектываў "Прыдзвінскія карункі", прысвечаным заслужанаму дзеячу культуры Беларусі І.А. Серыкаву, дзе атрымалі дыплом лаўрэата II ступені ў намінацыі "За лепшае выкананне аўтарскіх танцаў заслужанага дзеяча культуры Беларусі І.А. Серыкава" (сярод дарослых калектываў). У ліпені ансамбль "Лявоніха" ўдзельнічаў у XIII Міжнародным фестывалі-конкурсе народных танцаў "Судмалінас" (г. Рыга, Юрмала, Елгава, Латвія). Таксама ён прымаў удзел у гала-канцэрце агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці творчых калектываў і выканаўцаў Віцебскай вобласці (г. Віцебск).

Ансамбль "Лявоніха" працуе ў цеснай звязцы з узорным ансамблем "Гарэза".

Сёння, прыняўшы ў свае шэрагі таленавітую моладзь, ансамбль поўны творчага натхнення. Ён складаецца з харэаграфічнай, акампаніруючай і вакальнай груп – усяго больш за 60 чалавек. Некалькі разоў на тыдзень удзельнікі ансамбля збіраюцца ў рэпетыцыйнай зале, каб аддаць свае сілы любімаму захапленню. Кожная рэпетыцыя – гэта нябачная для гледача праца, якая дазваляе данесці каларыт і нацыянальную асаблівасць кожнага танца. У ансамблі займаюцца рабочыя і служачыя, студэнты, навучэнцы школ і каледжаў.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца "Лявоніха" актыўна супрацоўнічае з абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і з'яўляецца базай для правядзення майстар-класаў і

семінараў для кіраўнікоў харэаграфічных калектываў, а таксама практыкі для навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў.

Праз усю творчасць ансамбля танца "Лявоніха" праходзіць упэўненасць, што народны танец – асаблівае мастацтва, эксклюзіўны прадукт. Любоў да яго трэба гадаваць з дзяцінства, каб потым толькі адзін рух, толькі некалькі акордаў уздымалі ў душы вір пачуццяў, а захапленне танцам прайшло праз усё жыццё.

Сёння, як і заўсёды, Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца "Лявоніха" знаходзіцца ў добрым творчым стане і пастаянным пошуку ідэй і натхнення, многа і плённа працуе, рыхтуе новыя канцэртныя выступленні і абяцае радаваць свайго гледача цікавымі творчымі праектамі.